Упраўленне адукацыі Мастоўскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Азёркаўская сярэдняя школа”

*IX рэспубліканскі конкурс*
*на лепшы праект па арганізацыі шостага школьнага дня*



**ПРАЕКТ “КРОЧЫМ РОДНЫМ КРАЕМ, СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ ЗБІРАЕМ”**

**Аўтар:**
Халецкая Таццяна Аркадзеўна,
намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце

**Масты 2023**

ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ

АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

Інфармацыйная карта праекта

Сацыяльная значнасць праекта

Этапы і тэрмін рэалізацыі праекта

Чакаемые вынікі

Механізм рэалізацыі праекта

ЗАКЛЮЧЭННЕ

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ  КРЫНІЦ

ВЫНІКІ  РЭАЛІЗАЦЫІ  ПРАЕКТА

## Уводзіны

Мы жывём у цікавы і складаны час, калі шмат на што пачынаем глядзець па-іншаму, шмат што зноўку алкрываем і пераацэньваем. У першую чаргу, гэта тычыцца нашага мінулага, якое мы, аказваецца, ведаем вельмі павярхоўна. Што турбавала, цешыла і трывожыла нашых продкаў, чым яны займаліся, як працавалі, пра што марылі, распавядалі і спявалі, як пражылі гады ваеннага ліхалецця, што перадалі сваім дзецям і ўнукам? Адказаць на гэтыя пытанні сёння – значыць, аднавіць сувязь часоў, вярнуць згубленыя каштоўнасці, захоўваць гістврычную памяць. Звярнуцца да вытокаў дапаможа краязнаўства ва ўсіх яго праявах, бо яго змест – жыццё народа, чалавечы досвед, прасеяны праз сіта стагоддзяў, духоўны свет чалавека, яго думкі, пачуцці, перажыванні.

Суботні дзень з'яўляецца неад'емнай часткай цэласнага адукацыйнага працэсу. У дзяржаўнай установе адукацыі "Азёркаўская сярэдняя школа" кіраўніцтвам і педагагічным калектывам праведзена неабходная работа для стварэння спрыяльных умоў, якія садзейнічаюць сацыялізацыі асобы навучэнцаў і ўмацаванню сувязі з іх сем'ямі праз змястоўнае напаўненне шостага школьнага дня, праз рэалізацыю праекта "Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем". Праект накіраваны на фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, выхаванне гонару да сваёй малой радзімы, захаванне гістарычнай памяці, папулярызацыю гістарычнай спадчыны. У працэсе рэалізацыі праекта педагогі школы вучаць дружбе і супрацоўніцтву, фарміруюць маральныя паняцці і каштоўнасныя арыентацыі ў падлеткаў. Праца педкалектыва накіравана на павелічэнне працэнта ўдзелу ў выхаваўчым працэсе саміх дзяцей, а таксама іх бацькоў (законных прадстаўнікоў), праз розныя формы працы.

За многія гады работы школы тут склаліся свае адметныя асаблівасці, традыцыі, якія навучэнцы шануюць і прымнажаюць. У 2022 годзе стартаваў праект шостага школьнага дня "Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем" у рамках года Гістарычнай памяці. Мерапрыемствы праекта праводзіліся ў тэматычную суботу “Дзень грамадзянскага і патрыятычнага выхавання”. Суботні дзень стаў часткай цэласнай выхаваўчай сістэмы, і яго арганізацыя адлюстравана ва ўсіх відах планавання. Праграма праекта «Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем» прадстаўлена чатырмя блокамі - модулямі “Жывая спадчына”, “Пачастуйцеся людцы, калі ласка”, “Партызанскімі сцежкамі”, “Вандроўка ў этна-казку”.

## Інфармацыйная карта праекта

| № пп | Назва праекта | “Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем” |
|---|---|---|
| 1. | Мэта праекта | фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму, павышэнне ўзроўню краязнаўчых ведаў у падрастаючага пакалення, даследаванне асаблівасцей рэгіянальнай культурнай спадчыны на аснове ведаў пра гістарычнае мінулае. |

| | | |
|---|---|---|
| | Задачы праекта | - вывучыць узровень краязнаўчых ведаў навучэнцаў;<br>- фарміраваць цікавасць да даследавання гісторыі роднага краю;<br>- пашырыць веды вучняў аб мінулым і сучаснасці свайго рэгіёна, культурна-гістарычных асаблівасцях малой радзімы праз пошукавую дзейнасці, збор інфармацыі;<br>- садзейнічаць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці і грамадзянскай пазіцыі навучэнцаў праз актыўны ўдзел у мерапрыемствах, якія арганізуюцца ў рамках гэтага праекта |
| 2. | Чакаемые вынікі | Захаванне, развіццё і эфектыўнае выкарыстанне розных форм грамадзянскага і патрыятычнага выхавання вучняў у рамках шостага школьнага дня;<br>фарміраванне ў вучняў эмацыянальна - каштоўнасных адносін да гісторыі, культуры і традыцый малой радзімы;<br>новы погляд на вывучэнне самабытнай культуры, на адраджэнне і папулярызацыю народных танцаў, мясцовых культурных традыцый сваёй мясцовасці, вяртанню іх у жыццё маладога пакалення шляхам пераемнасці пакаленняў;<br>актывізацыя ўдзелу вучняў у выхаваўчых і сацыяльна-культурных мерапрыемствах шостага школьнага дня |
| 3. | Удзельнікі праекта | Навучэнцы дзяржаўнай ўстановы адукацыі, бацькоўская грамацкасць, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце, педагогі ўстановы адукацыі, педагог-арганізатар. |
| 4. | Тэрмін рэалізацыі | жнівень 2022 – май 2023 |
| 5. | Ідэя праекта | Дзейнасць праекта разлічана на адзін навучальны год. Мерапрыемствы праекта праводзяцца ў тэматычную суботу “Дзень грамадзянскага і патрыятычнага выхавання”. Суботні дзень стаў часткай цэласнай выхаваўчай сістэмы, і яго арганізацыя адлюстравана ва ўсіх відах планавання. Праграма праекта « Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем» прадстаўлена чатырмя блокамі – модулямі:<br>1. “Жывая спадчына” (I чвэрць)<br>2. “Пачастуйцеся людцы, калі ласка” (II чвэрць)<br>3. “Партызанскімі сцежкамі”(III чвэрць)<br>4. “Вандроўка ў этна-казку” (IVчвэрць) |
| 7. | Узроўні рэалізацыі | 1.Індывідуальна - асобасны<br>2. Класны |

| | | |
|---|---|---|
| | | 3. Агульнашкольны |
| 8. | Партнёры | Упраўленне адукацыі Мастоўскага райвыканкама, МРЦТДМ, КСУП "Азяранскі", Курылавіцкі сельскі выканаўчы камітэт", сельскі клуб "Азёркі", РАНС, РАУС. |

**Мэта праекта:**

фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму, павышэнне ўзроўню краязнаўчых ведаў у падрастаючага пакалення, даследаванне асаблівасцей рэгіянальнай культурнай спадчыны на аснове ведаў пра гістарычнае мінулае.

**Задачы:**

- вывучыць узровень краязнаўчых ведаў навучэнцаў;
- фарміраваць цікавасць да даследавання гісторыі роднага краю;
- пашырыць веды вучняў аб мінулым і сучаснасці свайго рэгёна, культурна-гістарычных асаблівасцях малой радзімы праз пошукавую дзейнасці, збор інфармацыі;
- садзейнічаць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці і грамадзянскай пазіцыі навучэнцаў праз актыўны ўдзел у мерапрыемствах, якія арганізуюцца ў рамках гэтага праекта.

Навучэнцы, члены аб'яднання па інтарэсах "Юныя экскурсаводы", выступілі ініцыятарамі цыкла гутарак аб малой радзіме, аб гісторыі танца "Котчынская кадрыля", героях і ўдзельніках Вялікай Айчыннай вайны. Рабяты правялі апытванне аб гісторыі, ваенных падзеях, знакамітых людзях, фальклоры, населенага пункта, дзе яны пражываюць. Значная частка навучэнцаў не ведала і ніколі не задумваліся аб тым, што іх малая радзіма багатая рознымі выдатнымі традыцыямі, працавітымі і таленавітымі людзьмі. Так і ўзнікла ідэя падарожжаў па малой радзіме. Была вызначана геаграфія падарожжаў. Рэалізоўваючы блокі-модулі навучэнцы вывучалі традыцыі, звычаі, нацыянальныя стравы свайго рэгіёну, сустракаліся з жыхарамі, наведвалі месцы пахавання, памятныя мясціны. Сабраўшы неабходныя звесткі аб гісторыі вёскі, самабытных традыцыях, культуры, знакамітых земляках, удзельніках і героях вайны, у выніку – прэзентацыя мерапрыемства модуля.

**Сацыяльная значнасць праекта**

Станоўчая дынаміка развіцця асобы:
набыццё ўдзельнікамі праекта ведаў аб гістарычным мінулым сваёй мясцовасці, трансляцыі сацыяльна – культурнага вопыту продкаў;
разуменне сутнасці аьранай справы, яе зместу;
самаразвіццё і самарэалізацыя – фактарф, якія азначаюць ядро змястоўнай дзейнасці шостага школьнага дня;
сацыяльна значны характар рэалізаваных ініцыятыў.

**Удзельнікі:**

Навучэнцы дзяржаўнай ўстановы адукацыі “Азёркаўская сярэдняя школа”, іх бацькі (законныя прадстаўнікі), намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце, педагогі ўстановы адукацыі, педагог-арганізатар.

**Стадыя развіцця праекта:** рэалізаваны.

**Тэрміны рэалізацыі праекта:**

**жнівень 2022 года- май 2023 года**

ЭТАПЫ І ТЭРМІН РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТА

| № п/п | Назва этапа | Срокі рэалізацыі | Змест этапа | Удзельнікі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Падрыхтоўчы | жнівень | 1.Дыягностыка ўзроўню краязнаўчых ведаў, выяўленне праблем. Тэарэтычная падрыхтоўка да стварэння праекта.<br>2. Банк ідэй і прапаноў па зместу праекта, выпрацоўцы стратэгіі і тактыкі яго рэалізацыі.<br>3. Падрыхтоўка ўдзельнікаў праекта (фарміраванне ініцыятыўнай групы, каардынацыя дзейнасці)<br>4. Дакументальнае афармленне праекта | Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце, кіраўнік музея “Наша спадчына”, класныя кіраўнікі |
| 2 | Практычны – рэалізацыя праекта | верасеь - красавік | 1. Кансультацыі для класных кіраўнікоў<br>2. Стварэнне мадэлі праекта.<br>3. Замацаванне класаў згодна з тэматыкай<br>4. Абмеркаванне маршрутаў паходаў, экскурсій, вандровак.<br>5. Кансультацыі для класных кіраўнікоў.<br>6. Абнаўленне інфармацыі на сайце установы адукацыі. | Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце, кіраўнік музея “Наша спадчына”, класныя кіраўнікі, навучэнцы, бацькі, законныя прадстаўнікі. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | 7. Збор матэрыялу, сустрэча з жыхарамі аг.В Азёркі, вёсак Котчына, Мілявічы, Дарагляны<br>8. Правядзенне майстар-класу па развучванню танца.<br>9. Наведванне старажылаў в.Лупачы, сведкаў падзей Вялікай Айчыннай вайны.<br>10. Падарожжа “Да суседзяў” у в.Мілявічы, Дарагляны. | |
| 3 | Заключны | май | Правядзенне творчых гасціных, майстар – класаў, напісанне водгукаў у мясцовую газету “Зара над Нёманам”, “Настаўніцкую газету”. | Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце, кіраўнік музея “Наша спадчына”, класныя кіраўнікі |

**Чакаемые вынікі**

захаванне, развіццё і эфектыўнае выкарыстанне розных форм грамадзянскага і патрыятычнага выхавання вучняў у рамках шостага школьнага дня;
фарміраванне ў вучняў эмацыянальна - каштоўнасных адносін да гісторыі, культуры і традыцый малой радзімы;
новы погляд на вывучэнне самабытнай культуры, на адраджэнне і папулярызацыю народных танцаў, мясцовых культурных традыцый сваёй мясцовасці, вяртанню іх у жыццё маладога пакалення шляхам пераемнасці пакаленняў;
актывізацыя ўдзелу вучняў у выхаваўчых і сацыяльна-культурных мерапрыемствах шостага школьнага дня;

**Ацэнка выніковасці праекта:**

1. Колькасныя паказчыкі:
- запатрабаванасць праекта;
- колькасць выкананых канкрэтных спраў і мерапрыемстваў;
- ахоп жыхароў аграгарадка ў час правядзення мерапрыемстваў

**Механізм рэалізацыіі праекта**

Ініцыятарамі праекта сталі члены аб'яднання па інтарэсах "Юныя экскурсаводы". Гэта цыкл аўтарскіх субот, якія праводзяцца на працягу навучальнага года ў першую суботу месяца. Аўтарамі тэматычных субот з'яўляюцца ініцыятыўныя творчыя групы дзяцей і дарослых.

Кожны блок – модуль рэалізуецца на працягу чвэрці, вызначаюцца актуальныя тэмы, якія найбольш яскрава характарызуюць людзей, уклад жыцця, гісторыю развіцця роднага краю.

У структуры адукацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі акцэнт робіцца на грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне. Для фарміравання светапогляду навучэнцаў, у адпаведнасці з дзяржаўнай ідэалогіяй, педагогі актыўна выкарыстоўваюць выхаваўчы патэнцыял навучальнага працэсу і пазаўрочнай дзейнасці. Удзяляецца вялікая ўвага рабоце па выхаванню ў навучэнцаў павагі да дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь.

**Блок - модуль "Жывая спадчына".**

У верасні цыкл мерапрыемстваў быў адкрыты падарожжам у вёску Котчына, дзе рабяты сустрэліся з мясцовымі жыхарамі, старажыламі вёскі, якія паведамілі аб гісторыі танца "Котчынская кадрыля". Першы раз у 1960 годзе кадрылю танцавалі на хрысцінах дачкі Ларысы ў Брыгадзір Яўгеніі Ігнацьеўны, дзе прысутнічала дырэктар Котчынскага Дома культуры Калбасенкава Марыя Вікенцьеўна. Гэты танец ёй вельмі спадабаўся, і яна стварыла пры клубе танцавальны калектыў. На розных мерапрыемствах, якія праходзілі ў клубе, калектыў прымаў актыўны ўдзел.

Аб сучасным жыцці "Котчынскай кадрылі" вучні ведаюць шмат, яны таксама з гонарам сталі удзельнікамі фальклорна-харэаграфічнага гуртка "Рэчанька", без якога не абходзіцца не адно школьнае, мясцовае мерапрыемства. Рабяты з задавальненнем вырашылі правесці майстар-клас танца на брэндавым мясцовым святе "Па сцежках спадчыны", якое штогод праходзіць на тэрыторыі агр.В.Азёркі ў першую нядзелю чэрвеня.

**Блок – модуль "Пачастуйцеся, людцы, калі ласка".**

Праца па праекце ў гэтым модулі была накіравана на знаёмства з асаблівасцямі і перавагамі сям'і ў галіне кулінарыі, нацыянальнымі стравамі. У выніку, удзельнікі праекта прадставілі прэзентацыю сямейных рэцэптаў, страў на кірмашы, які прайшоў у снежні.

**Блок – модуль "Партызанскімі сцежкамі".**

Захоўваць гістарычную памяць для будучых пакаленняў ва ўмовах сённяшніх рэалій становіцца асабліва важна. Чым больш час адзяляе нас ад Вялікай Айчыннай вайны, тым цяжэй адкрыць у ёй штосьці новае. І тым менш застаецца надзей на ўстанаўленне імёнаў невядомых салдат, якія да гэтага часу тысячамі пакояцца ў нашай шматпакутнай зямлі. А калі і пашчасціць знайсці ў захараненні салдацкі медальён, то прачытаць яго запіску ўжо проста немагчыма. Спытаць у нейкіх жывых сведкаў? Іх ужо амаль не засталося. І тым больш каштоўным становіцца адкрыццё яшчэ аднага імені салдата, які 80 год для яго родных і блізкіх значыўся без вестак прапаўшым. На працягу рэалізацыі модуля вучні правялі

даследчую дзейнасць, у выніку якой было ўстаноўлена імя салдата, які пахаваны на могілках у в.Лупачы, напісана даследчая работа.

**Блок – модуль “Вандроўка ў этна-казку”.**

Удзельнікі праекта, грунтуючыся на раней прадстаўленай інфармацыі аб той ці іншай мясцовасці, выбіраюць вёску-пабрацім, паміж якімі ўсталяваныя сталыя дружалюбныя сувязі для ўзаемнага азнаямлення з жыццём, гісторыяй і культурай. Выбар выпаў на аг.Мілявічы, в.Дарагляны. Рабяты падтрымліваюць уесныя сувязі з суседняй ДУА “Мілявіцкай сярэдняй школай”, праводзяцца сумесныя піянерскія кастры, тэматычныя дыскатэкі. У некаторых з іх, бацькі, нарадзіліся і выраслі ў суседніх вёсках. Падчас падарожжа ўдзельнікі праекта наведалі старажылаў суседняй вёскі, пазнаёміліся з бытам сялянскай хаты.

Абрады і святы – таксама тэма гэтага модуля. Удзельнікі ажыццяўляюць лакальны пошук шляхам апытвання, збору фотаархіваў, апавяданняў аб правядзенні тых ці іншых свят у пару дзіцячых гадоў членаў сям'і.

Кожны куток Беларусі захаваў моўныя, фальклорныя, этнаграфічныя і іншыя асаблівасці, звычаі і традыцыі. Ёсць такія куточкі і ў нашым рэгіёне, на Мастоўшчыне.

## Заключэнне

Мэта праекта па фарміраванню грамадзянскасці і патрыятызму, павышэнню ўзроўня краязнаўчых ведаў у падрастаючага пакалення, даследаванню асаблівасцей рэгіянальнай культурнай спадчыны на аснове ведаў пра гістарычнае мінулае дасягнута.

Сінтэз розных метадаў і форм, выкарыстаных пры арганізацыі работы па праекце, паказаў станоўчыя вынікі: усе навучэнцы ўцягнуты ў арганізаваную дзейнасць па рэалізацыі праекта, назіраецца станоўчая дынаміка ўзроўню выхаванасці навучэнцаў, у большасці навучэнцаў сфарміравалася станоўчая матывацыя да вывучэння гісторыі, пытанняў краязнаўчай накіраванасці, дзякуючы набыццю даследчых уменняў. . Навучэнцы атрымалі навыкі працы ў калектыве, рознаўзроставых групах, навучыліся зносінам з людзьмі розных сацыяльных сфер.

Даследаванне дало магчымасць яшчэ раз дакрануцца да духоўнай спадчыны, да народных традыцый і звычаяў свайго рэгіёна, усвядоміць непарыўную сувязь нашага вядомага танца “Котчынская кадрыля” з духоўнай культурай беларусаў.

Вывады наступныя:

сучаснае пакаленне – гэта маладыя людзі, якія лёгка ўсяму вучацца, дзякуючы сучасным новым тэхналогіям. Але разам з тым, ім цікава і тое, чым жылі іх папярэднія пакаленні. Таму бачна, што яны здольны будаваць узаеміны паміж сабой, выкарыстоўваючы нормы, каштоўнасці і традыцыі сваіх продкаў, ім уласціва шчырасць пачуццяў, узаемападтрымка, пачуццё адказнасці за даручаную справу; яны гатовы да самавызначэння і самарэалізацыі. Разам з гэтым, яны фізічна, маральна здаровыя, атрымліваюць задавальненне ад таго, чым займаюцца. Гэта ўсё спрыяе таму, што маладыя людзі ў будучым стануць запатрабавальнымі спецыялістамі і актыўнымі грамадзянамі, патрыётамі нашай

любімай краіны. Адчуванне асалоды (гэтага нельга было не заўважыць!) падчас і пасля сустрэчы з мінуўшчынай - найвышэйшы паказчык адносін вучняў да гэтай патрэбнай справы па спасціжэнні багаццяў нашых продкаў, спазнанні ўкладу іх жыцця.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАХ КРЫНІЦ


1. Бедулина, Г. Ф. Методическое сопровождение идеологической работы в общеобразовательных учреждениях: пособие для зам. директоров шк. по воспитательной работе, кл. рук., педагогов / Г. Ф. Бедулина. – Минск : НИО, 2007. – 192 с.
2. Бедулина, Г. Ф. Современные информационно-коммуникационные технологии идеологической и воспитательной работы в общеобразовательном учреждении / Г. Ф. Бедулина // Кіраванне ў адукацыі, 2010. – №7.
3. Бедулина, Г. Ф. Формы и методы патриотического воспитания молодёжи в современных условиях / Г. Ф. Бедулина // Праблемы выхавання. – 2009.
4. Буткевич, В. В. Гражданское воспитание детей и учащейся молодежи: пособие для рук. учреждений образования, педагогов, классных руководителей и студентов / В. В. Буткевич. – Минск: НИО, 2007. – 280 с.
5. Гісторыка-культурныя каштоўнасці Мастоўшчыны. Мясцовы танцавальны стыль «Котчынская кадрыля» [Электронный ресурс]. Рэжым доступу: http://moskult.by/pages/nacionalno-kulturnoe-nasledie.html.–Дата доступу: 27.01.2017
**6.** Официальный Интернет-портал Президента Республики Беларусь [Электронный ресурс]. –Режим доступа: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/torzhestvennoe-chestvovanie-peredovikov-apk-belarusi-18085/. – Дата доступа: 18.01.2019.
7. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь на 2021-2025годы: утверждена постановлением Министерства образования Республики Беларусь от 31.12.2020 № 312 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://edu.gov.by/page-14301. – Дата доступа – 10.08.2022


## ВЫНІКІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТА

Раённы этап конкурсу "Музейны рэтрыт", Гарбацэвіч І.А., 1 месца.
Раённы этап рэспубликанскага конкурсу "Славутыя роды свайго краю", Рудэнко В., дыплом І ступені, кіраўнік Гарбацэвіч І.А.
Раённы этап рэспубліканскага конкурсу "Збяры Беларусь у сваім сэрцы", намінацыя "Край.by",Дзядовіч Д.,дыплом І ступені, кіраўнік Шэлястовіч А.А.
Раённы этап конкурса "Листая страницы семейного альбома", номинация "Судьба моей семьи в истории страны", дыплом ІІ ступені, кіраўнік Гарбацэвіч І.А.
Раённы этап рэспубліканскага конкурсу "Я родным краем ганаруся", Батракова Дар'я, дыплом ІІ ступені, кіраўнік Халецкая Т.А.

Абласны этап рэспубліканскага конкурсу "Я родным краем ганаруся", Дубіцкая П., дыплом III ступені, кіраўнік Галавач Т.А.,  Дзядовіч Дар'я, дыплом III ступені, кіраўнік Галавач Т.А.
Раённы этап рэспубліканскага конкурсу "Я родным краем ганаруся!", Дзядовіч Д, дыплом II ступені; Дубіцкая П., дыплом II ступені, кіраўнік Галавач Т.А.
Раённы этап рэспубліканскага конкурсу "Я помню! Я горжусь!", дыплом I ступені, Халецкая Т.А.
Раённы этап абласнога конкурсу відэаролікаў "Память о прошлом сохраним", дыплом  I ступені, кіраўнікі Халецкая Т.А., Чудзілоўская Т.У.
Раённы этап рэспубліканскага конкурсу "Радзімы спадчына- мой гонар", Дзядовіч Дар'я, дыплом I ступені, кіраўнік Галавач Т.А.
Адкрытая абласная навукова-практычная канферэнцыя «НАВУКА ПЕРАМАГАЦЬ», прысвечаная 77-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, дыплом III ступені, кіраўнік Гарбацэвіч І.А.

МЫ Ў СМІ

“Вандруем разам з сям’ёй”, 19.10.2022.Зара над Нёманам
"Сцяжынкамі роднай зямлі", 09.11.2022, №86 Зара над Нёманам,
"Фальклорная вандроўка", Настаўніцкая газета, 11.11.2022
"З любоўю да роднай зямлі", 02.11.2022 № 84, Зара над Нёманам
Цікавая вандроўка, 29.11.2022, Зара над Неманам
Мостовские школьники почтили память погибших земляков,20.12.2022, Зара над Неманам
Вядомае имя невядомага салдата, Зара над Неманам, 24.12.2022
Вечарына "Як у нашай бабкі смачныя аладкі", НТ.М.Шэлястовіч, Народная асвета, № 3 2023, с.84
Квест "Па сцежках спадчыны", Т.Пчэльнік, Народная асвета" № 3 2023, с.82-83
Калядныя традыцыі ў Азёркаўскай школе,Зара над Нёманам, 17.01, 2023, І.Гарбацэвіч